няюць усё жывое. Любяць падглядаць, як бавіць час моладзь, у якія ўпрыгажэнні апрануты вясковыя дзяўчаты. Калі сукенка спадабалася, Г. могуць зняць яе з дзяўчыны. У купальскую ноч яны любуюцца на цвіценне папараць-кветкі. Калі чалавек неўпрыкмет пойдзе за Г., то яны прывядуць яго да чароўнай кветкі. Г. часткова нясуць у сабе рысы *русалак*.

*У.А.Васілевіч.*

**ГАЗЕ́ЛЬ** (ад арабскага газаль), від манастрафічнага лірычнага верша. Пабудаваны на 3—12 двухрадкоўях (бейтах) з рыфмоўкай аа, ба, ва і г.д., якія ўтрымліваюць завершаную думку і маюць адносна самаст. значэние. У апошнім бейце ўпамінаецца імя, прозвішча ці псеўд. аўтара. Як цвёрдая вершаваная форма Г. нарадзілася з нар. лірычнай песні народаў Блізкага і Сярэдняга Усходу, Індыі і Пакістана прыкладна ў 7 ст., канчаткова сфарміравалася ў 13—14 стст. Росквіту дасягнула ў творчасці Рудакі, Саадзі, Хафіза, Камаля, Джамі, Нізамі і інш. З 19 ст. гэты від верша пранік у еўрап. л-ру (І.В.Гётэ). У рас. версіфікацыю. Г. увёў В.Брусаў, ва ўкр. — І.Франко, у бел. — Р.Крушына. Да Г. ў сваёй творчасці звярталіся Э.Акулін, Ю.Голуб, С.Ліхадзіеўскі і інш.

*І.М.Гоўзіч.*

**ГАЗЕ́ТА**, адна з састаўных частак сродкаў масавай інфармацыі (СМІ), перыядычнае друкаванае або электроннае дзярж. ці прыватнае выданне, якое дае звесткі пра афіц. жыццё, паліт., эканам., сац., культ. і інш. падзеі сваёй і замежных краін. Мае перыядычнасць, фармат і тыраж. У еўрап. краінах звесткі з ВКЛ друкаваліся прыкладна з 2-й пал. 16 ст. — пач. 17 ст. Першай Г. у ВКЛ лічацца «Навіны грозныя а жалостлівыя», надрукаваныя ў 1563 у Нясвіжы. Сярод першых друкаваных Г. у ВКЛ і ў Беларусі — інфармацыйны бюлетэнь *«Авізы Гродзеньске»*. З 1776 да 1783 у Гродне па ініцыятыве А.Тызенгаўза выходзіла прыватная Г. *«Газэта Гродзеньска»*. У 1792 у Гродне выдаваліся *«Вядомосьці Гродзеньске»*. У Вільні з 1760 да 1840 выдавалася Г. *«Кур’ер Літэўскі»* з дадаткамі. У 1764—94 выходзіла выданне *«Газэты Віленьске»*. З 4.5.1773 да 6.8.1794 выдавалася *«Газэта Народова Віленьска»*. Пасля далучэння Беларусі да Рас. імперыі ў 2-й пал. 18 ст. былі заснаваны друкаваныя органы губернскіх праўленняў: *«Виленские губернские ведомости»*, *«Витебские губернские ведомости»*, *«Гродненские губернские ведомости»*, *«Минские губернские ведомости»*, *«Могилёвские губернские ведомости»*. Выходзілі перыяд. выданні праваслаўнай царквы: *«Полоцкие епархиальные ведомости»* (Віцебск), *«Минские епархиальные ведомости»*, *«Могилёвские епархиальные ведомости»*, *«Гродненские епархиальные ведомости»*. У Вільні выдавалася грамадска-паліт., літ. і эканам. Г. *«Северо-Западное слово»*. Першым нац. перыядычным органам была Г. *«Мужыцкая праўда»*, якую выдавалі нелегальна ў 1862—63 К.Каліноўскі і яго паплечнікі. Яна заклікала беларусаў, літоўцаў, палякаў да сумеснай барацьбы за сваё сац. і нац. вызваленне. У 1886—1902 выходзіла першая ў Беларусі прыватная грамадска-паліт. і літ. Г. *«Минский листок»* (з 1902 *«Северо-Западный край»*). У канцы 19 ст. ў Беларусі выдавалася 14 газет, у т.л. 3 прыватныя. У пач. 20 ст. ў Беларусі з’явілася вялікая колькасць новых перыяд. выданняў розных паліт. кірункаў. У Мінску выдаваліся Г. *«Белорусский вестник»*, *«Голос провинции»*, *«Минское слово»*, *«Жизнь провинции»*, *«Окраина»*, *«Минское эхо»*, *«Минский голос»*; у Віцебску — *«Витебский голос»*, *«Витебский вестник»*, *«Витебский листок»*; у Вільні — *«Северо-Западный голос»*, *«Белорусская жизнь»*; у Магілёве — *«Могилёвский вестник»*; у Гомелі — *«Гомельский вестник»*, *«Полесье»*, *«Гомельское слово»*, *«Гомельская копейка»*, *«Отклики»*; у Брэсце — *«Наш край»*; у Бабруйску — *«Бобруйский курьер»*; у Оршы — *«Оршанский вестник»* і інш. Выдаваліся Г. таксама ў Лепелі, Лідзе, Полацку і інш. У 1905 была адменена забарона на нац. выданні і ў 1906 на бел. мове выйшла першая легальная Г. *«Наша доля»*, у 1906—15 выходзіла *«Наша ніва»*. У Вільні на бел. мове друкаваліся Г. *«Белая Русь»*, *«Беларус»* (лацініцай), *«Гоман»* (лацініцай і кірыліцай), у Петраградзе — *«Светач»* (лацініцай), *«Дзянніца»*. Яны вялі барацьбу за аб’яднанне народа, бел. дзяржаўнасць, бел. нац. ідэю, нац. гісторыю, мову і культуру. У 1-ю сусв. вайну выдаваліся газеты «Вестник X армии» (Маладзечна, 1914—17), «Известия комитета Западного фронта» (Мінск, 1916—17), «Последние армейские известия» (Полацк, 1915—17), «Известия Виленского округа путей сообшения» (Бабруйк, 1916) і інш., газетныя выпускі «Телеграмм Петроградского телеграфного агенства» друкаваліся ў Барысаве, Клецку, Лунінцы, Ляхавічах, Навагрудку, Нясвіжы, Пінску, Рэчыцы, Слуцку. Падзеі 1917 абумовілі выданне Г. Часовага ўрада, а таксама Г. нац.-дэм. і сацыяліст. кірункаў. Яны сталі дзейсным сродкам барацьбы розных партый і рухаў, саветаў і камітэтаў за пашырэнне сваіх ідэй. Першым масавым бальшавіцкім выданнем у Беларусі стала Г. *«Звязда»*. Пасля Лют. і Кастр. рэвалюцый 1917 у Беларусі выдаваліся і распаўсюджваліся Г. *«Белорусская рада»*, *«Бюллетень военно-революционного комитета Западного фронта»*, *«Вестник Минского губернского комиссариата»*, *«Вольная Беларусь»*, *«Грамада»*, «Известия военно-революционного комитета города Витебска» (з 1937 *«Віцебскі рабочы»*), *«Крестьянская газета»*, «Революционная ставка» (Магілёў, 1917—18), *«Советская правда»*, *«Фронт»* і інш. Свае друкаваныя органы мелі Саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Віцебска, Гомеля, Магілёва, Мінска, а таксама Бабруйска, Горак, Мазыра, Полацка, Рэчыцы і інш. гарадоў. У 1918—19 у Петраградзе, а затым у Маскве выходзіла першая сав. Г. на бел мове *«Дзянніца»*, у Смаленску, затым Маскве — Г. *«Бедняк»* і *«Савецкая Беларусь»*. Нягледзячы на цяжкасці ваен. часу, з’явіліся новыя перыяд. выданні ў Мінску, Вільні, Гродне, Гомелі і інш. У 1920 у Беларусі выходзіла 27 газет. У сувязі з нэпам і пераходам да мірнага будаўніцтва была створана шырокая сетка Г., якія з’яўляліся афіц. органамі Саветаў і парт. к-таў усіх узроўняў, што вызначала змест і задачы гэтых выданняў. У Мінску выходзілі Г. *«Беларуская вёска»*, «Рабочий» (гл. *«Советская Бело-*